*   *   *

**Памяці майго дзеда,**
**Мазура Мікалая Ульянавіча**

Мой дзед быў партызанам у вайну.
Бязвусым юнаком з блакітнымі вачыма.
Сваю сямнаццатую ён сустрэў вясну
Ў атрадзе Мельнікава ў бітвах за Айчыну.

І неаднойчы мой геройскі дзед
Глядзеў у твар бязлітаснае смерці...
Але, даў Бог, і з пекла тых падзей
Жывым ён выйшаў... не забілі немцы...

Прынесла перамога шмат надзей,
Каханне і сям'ю, будоўлю хаты.
Настаўнікам у школе любы дзед
Пасля вучобы працаваў заўзята!

Ён быў таленавітым ува ўсім:
Вырэзваў з дрэва розныя фігуры,
Араў, натхнёна сеяў і касіў,
Вёў дзённік пра прыродныя віхуры...

Глядзеў за садам, яблынькі саджаў,
І мэблю ладзіў, як цясляр майстэрскі.
Мой дзед быў незвычайны гаспадар,
І верны сын зямлі сваёй Палескай.

Як свята ў хаце – на гармоніку іграў
З агеньчыкам, ды асабліва полькі...
Але ўсяму ёсць скон... Прайшла яго пара...
Няма дзядулі вунь ужо год колькі...

...Ды памяць – быццам вечнасці глыток.
І сувязь пакаленняў не парвецца,
Бо партызанскі дзедавы квіток
Маім нашчадкам скарбам застанецца...

**Ірына Сусленка**

## БАБУЛІНЫ СНЫ

Слёзы засцяць бабуліны вочы,
Цісне сэрца балюча ў грудзях:
– Колькі раз прачынаюся ўночы,
Адчуваючы жудасны страх...
Рвуцца бомбы – калоцяцца хаты,
Самалёты страшэнна гудуць,
Ды па вёсцы чужынцы-салдат,
Як драпежнікі, злыя ідуць.
Быццам зноў я, сястра і матуля
Ў лес спяшаемся да партызан...
Суцяшаю пяшчотна бабулю:
– Не хвалюйся, не плач – гэта ў снах.
А наяве – блакітнае неба,
Сонца ззяе і кветкі цвітуць,
Ёсць удосталь духмянага хлеба,
Людзі мірныя ў шчасці жывуць.
Цішыня і спакой – зорнай ноччу
На зямлю толькі знічкі ляцяць.
...Выцірае бабулечка вочы –
А мае сэрца ные ў грудзях...

**Ірына Сусленка**

## ПАМІНАЛЬНЫЯ ЗВАНЫ

У нескароная памяці народнай
Жывуць ахвяры жудаснай вайны...
О, колькі год па душах нашых родных
Галосяць памінальныя званы!

Галосяць сумна па забітых дзетках,
Што нават і гадочку не жылі.
По хлопчыках – зусім яшчэ падлетках,
Што ў партызаны за бацькоў ішлі.

По састарэлых ад бяды матулях
З лісткамі пахавальнымі ў руках.
І па дзядах нядужых і бабулях,
Што ў тыле працавалі на станках.

Галосяць, надрываюцца званочкі
І сэрца рвуць, як выбухі ў вайну,
Па дочках ненароджаных, сыночках,
Па жаніхах, што леглі не ў труну.

Па маладых дзяўчатах, пасівеўшых
Ад непасільных і раптоўных страт,
Па іх ружовых марах, абгарэўшых
На папялішчы зруйнаваных хат...

Звіняць званы па воінах-героях,
Іх подзвіг услаўляюць у вяках!
Стаяць салдаты ў бронзе над гарою.
Дрыжаць пялёсткі кветак на вянках...

**Ірына Сусленка**

## МЫ РАЗАМ

Каб гора развеяць, бяду,
Да чыстай вады прыпаду,
Да чыстай крынічнай вады,
Што сілы дае мне заўжды.
І стане святлей далягляд –
Мая дарагая зямля.
Адчую пяшчотны спакой:
Ты разам са мной, я – з табой.
Ад цяжкай жыццёвай хады
На скоронях бялеюць сляды...
Ідзеш ты па шляху сваім
Да шчасця праз хмары і дым.
О, колькі стагодзяў у скрусе
Прыйшлося пражыць Белай Русі.
Адчуй жа пяшчотны спакой:
Ты з намі навек, мы – з табой!

## ТАБЕ, БЕЛАРУСЬ!

Стаю на прыгорку высокім,
Ляжыць пад нагамі абшар,
І позіркам лашчу аблокі –
Пристанішча зоркавых мар.
А бусел крылаты старанна
Вартуе бязмежную сінь.
Табе, Беларусь, мы аддана
Жадаем сусветных вышынь!

**Ірына Сусленка**

## СТО ДАРОГ

Сто дарог нас паклічуць марай за парог.
Так парой здараецца ў жыцці,
Што сыны шукаюць шчасце недзе па планеце.
Сто краін, сто чужых халодных ручаін,
Незнаемых безліч гарадоў
Палоняць позірк, толькі не душу.

Рай на свеце – родны край!
"Ура!" крычу – дамоў на крылах я лячу.
Музыка грай, Радзіма сустракай!
К табе адной вядуць праз цэлы свет усе сто дарог!
Сто дарог...

Мовы смак не забудзецца нідзе, ніяк.
На далекіх дзіўных берагах
Яўна адчуваю: без Радзімы немагчыма.
Прыдзе час – пасталее сэрцам кожны з нас
І захоча добры ясны след
Навек пакінуць на сваёй зямлі.

Рай на свеце – родны край!
"Ура!" крычу – дамоў на крылах я лячу.
Музыка грай, Радзіма сустракай!
К табе адной вядуць праз цэлы свет усе сто дарог!
Сто дарог...

**Ірына Сусленка**

# МУЗЫКА МАЁЙ КРАІНЫ

Недзе ў небе сінім-сінім
Птушак чарада плыве.
Там у клёкаці буслінам
Наша музыка жыве –
Музыка маёй краіны.
Ёй зусім не трэбы слоў.
Як зайграе – за хвіліны
Разліе ў душы цяпло.
З ёю разам назаўсёды
Мы, як сёстры і браты.
Музыка майго народу,
Любы твой задор святы!

**Ірына Сусленка**

## ГІМН МАЗЫРУ

Дзе Прыпяць магутная кроіць абшары,
Ад замкавай вежы на Спаскай гары
Гісторыя наша праз войны, пажары
Ідзе вечнай славаю аб Мазыры.
Нам горад застаўся ад продкаў далёкіх,
Тут нашы вытокі і тут карані.
Стаіць над ярамі – раздольны, высокі –
І вабіць красою, куды ні зірні.
Мазыр! Родны горад, квітней год ад году,
Каб вечна сады на Палессі цвілі.
З табой мы – у шчасці, з табой мы – у горы,
Ты гонар усёй Беларускай зямлі!
Мазыр – працаўнік прамыслова-вытворчы.
Штогод у будоўлях, як волат, расце.
Па светлым жыцці ён упэўнена крочыць,
У святы сардэчна прымае гасцей.
Сяброўствам натхнёны і таленавіты,
Наш горад у гушчы сусветных падзей.
Няхай жа навекі ён будзе адкрыты
Для шчырых, сумленных і добрых людзей!
Мазыр – год ад году квітней, родны горад,
Каб вечна сады на Палессі цвілі.
З табой мы – у шчасці, з табой мы – у горы,
Ты гонар усёй Беларускай зямлі!

**Ірына Сусленка**

**ВІВАТ,  ГОРАД РОДНЫ!**

Палессе – край дзіўны,
Цудоўны мой край!
Часцінка Радзімы
Для сэрцайка – рай!
Тут продкаў далёкіх
Падтрымку чуваць,
Тут мроям высокім
Гарэць – не згасаць.
У прыпяцкіх водах
Самоту ўтаплю,
Паветрам свабодным
Душу наталю.
Прайдуся па ціхім
Начным Мазыры,
Па вулічных стужках:
Угору – згары.
Наводдаль санліва
Блішчаць ліхтары...
Быць самай шчаслівай
У промнях зары
Пад Белае Русі
Пяшчотным крылом
Я век не стамлюся.
Бацькоўскі мой дом!
Табе, мой лагодны,
Цвісці, нібы сад.
Віват, горад родны!
Мазыр мой, віват!

**Ірына Сусленка**

# МАЗЫР - МАЯ СВЕТЛАЯ ПЕСНЯ!

Мазыр – мая светлая песня!
І сэрца маё, і душа!
Пяшчотна гляджу ў паднябессе –
У родны блакітны абшар –
І думку прыемна люляю:
Якая навокал краса!
Вы бачылі, як аздабляе
На досвітку травы раса?
А як наліваецца колас
На полі бабро ўскім – тугі...
Сядайма на «чортава кола»
Глядзець за ракою лугі!
Вясною яны – заліўныя
Да сонечных Баравікоў.
Але жыхары – не з пужлівых:
Жывуць больш за восем вякоў
На беразе левым і правым,
На нізенькім і на крутым –
Вядуцца штодзённыя справы,
Не лічацца ў шчасці гады...
А побач магутная Прыпяць
Ва ўсёй першатворнай красе,
Як сведка падзей і адкрыццяў,
Задумліва воды нясе...
Нам край гэты дадзены Богам:
Палессе – і доля, і лёс.
Куды б не завесці дарогам –
Вышэйшых не знойдзеш нябёс!
К сабе вабіць так неадольна
Куточак радзімай зямлі
Красою і шыр'ю раздольнай,
Айчынным даверам сваім.
І кожнаму з нас асабіста
Гараць з пажаданнямі  "жыць!"
Над цэрквамі ў сіні празрыстай
Надзеі  і веры крыжы...
Звярнуся да сілаў нябесных –
За ўсіх памалюся ізноў.
Пачуццям у сэрцы так цесна,
І мне не стрымаць шчырых слоў:
"Мазыр –  гэта песня Палесся!
Дары яму, Божа, любоў!"

**Ірына Сусленка**

## СУСТРЭНЕМ СВЯТА!

Цудоўны край палескі старажытны
Пакліча зноў у круг сваіх сяброў!
Ужо сабралі і авёс, і жыта
Ўсе гаспадаркі са сваіх палёў.
Ды на капалі бульбы і цыбулі –
Няхай прыходзіць зімняя пара.
Выходзьце, дзеткі, мамы і бабулі,
Выходзьце ўсе на плошчу са двара –
Сустрэнем свята! Музыканты, грайце!
І песня родная над Прыпяццю ляці!
Усе пачуйце ды ўсе людзі знайце:
Другога Мазыра на свеце не знайсці!

* * *

Шануйце свой горад – куточак Радзімы!
Бо ён, як бацькі, як і лёс ваш, – адзіны.
Здзіўляйцеся кожнай падзеі і з'яве,
Бо ўсё непаўторна, дзівосна наяве:
І тое, што ў небе блакітным над плошчай
Буслы свае крылы ў паветры палошчуць;
І тое, як хвалі найпеністай масці
Па рэчцы вандруюць у пошуках шчасця.
А вунь, паглядзіце, на крылах арэлі
Ляцяць хутка ў вырай, дзе сонейка спее,
Дзе кружацца з ветрыкам мар карагоды...
Аж сэрца пяе ад тае асалоды...
Любіце Мазыр свой – часцінку Радзімы:
Ён дадзены лёсам, адзін... і адзіны...

**Ірына Сусленка**

* * *

Дзень вераснёўскі ў Мазыры:
Падручнікі, партфелі, кветкі...
Стаіць гімназія ўгары –
Вучнёўскіх хваляванняў сведка...

* * *

Мой горад родны –
мой зялёны востраў
Надзеі, дабрабыту, чысціні.
З табою быць шчасліваю мне проста,
Як вольнай птушцы ў сіняй вышыні...

* * *

Паласкала праменьчыкі сонца
У сцюдзёнасці прыпяцкіх хваль...
А Мазыр, абаяльны бясконца,
Запрашаў нас на восеньскі баль...

* * *

Мазырскай восені празрыстай акварэлі...
Кранае дзіўная краса душу да слёз...
А ўзнёслых думак легкакрылыя арэлі
Мяне з зямлі ўздымаюць да нябёс!
І з вышыні птушынага палёту,
Разводзячы рукамі цемру хмар,
Я ахінаю горад свой пяшчотай –
Прыношу сонца на яго алтар...

* * *

Гук шасціструннае гітары,
Сяброў усмешлівыя твары,
І мары, зоркавыя мары,
Што лёс уласны асвячаюць,
Табе, Мазыр мой, прысвячаю!

**Ірына Сусленка**

**РОДИНА МОЯ**

Акварельная даль – сердце тает от нежности,
Растворяя печаль в этой милой безбрежности…
Здесь родная земля нам судьбою дана,
Словно сказочный дар.
Вместе навсегда!
И через года
На круги своя всё воротится.
Дома на душе распогодится…
Исцели цветными снами –
И пребудет сила с нами,
Родина моя… Мудрая такая…

Нараспашку ветра между солнцем и грозами.
Пролетают века в небе яркими звёздами…
Все дороги пройдя, обретаю тебя,
Мой родительский край.
Вместе навсегда!
И через года
На круги своя всё воротится.
Дома на душе распогодится…
Исцели цветными снами –
Счастье вновь проснётся с нами,
Родина моя… Нежная такая одна…

**Ирина Сусленко**

## ПОСВЯЩЕНИЕ МОЗЫРЮ

Опоясанный лесом дремучим,
Ограненный глубокой рекой
Город мой, словно аист над кручей,
Взмыл под небо, да так высоко
Над лугами, весной заливными,
Над ярами, где в пояс трава,
Над полями ржаными, цветными,
Затаившими водный овал,
Что порой у гостей иноземных
Перехватит дыханье в груди:
Хороши благодатные земли!
И по ним бы ходить и ходить
Босиком, нараспашку рубаха,
Чтобы ветер не в спину – в лицо,
Наслаждаясь свободой размаха,
Растворяясь в наследстве отцов...

## КОЛЫБЕЛЬНАЯ,
## или КРЕЩЕНСКИЙ ДЖАЗ

Дремлет Мозырь, утопая
В звуках зимнего оркестра:
Вьюга фуги исполняет
Неизвестного маэстро.
Завывает соло ветер
На охрипшем саксофоне –
Ноты скачут, словно черти,
В этом рвущем душу стоне.
Барабанит снег по крышам,
Выбивает дробь по окнам,
И мороз трещит чуть слышно
В унисон дрожащим стеклам.
Грациозная поземка
Тонкой стрункой звонко рвется.
И в ее аранжировке
Ночь то плачет, то смеется.
Кружит музыка метелью
Над Полесским дивным краем,
И в ледовой колыбели
Сладко Припять засыпает...

Ирина Сусленко

## ПЕСНЯ О МОЗЫРЕ

Полесских узоров причудливы краски на солнце весеннем,
Хоть город наш древний, но как он прекрасен в свой день рожденья!
Немало на долю его выпадало лихих испытаний,
И память о предках сердца обжигает огнем на Кургане...
Мозырь, Мозырь!
Шумят молодою листвою березы.
Мозырь, Мозырь!
В стихах мы тебя воспеваем и в прозе.
Мозырь, Мозырь!
Звенят ли капели, грохочут ли грозы,
С тобой навсегда мы повенчаны, Мозырь,
Незримою нитью любви!

Над Припятью будут звенеть, не смолкая, заздравные песни.
Как здорово, что в этот день собирает наш город всех вместе.
Для дружбы большой не страшны расстояния, таможни, границы.
Мы рады гостям и мы всех приглашаем в Полесья столицу!
Мозырь, Мозырь!
Шумят молодою листвою березы.
Мозырь, Мозырь!
В стихах мы тебя воспеваем и в прозе.
Мозырь, Мозырь!
Звенят ли капели, грохочут ли грозы,
С тобой навсегда мы повенчаны, Мозырь,
Незримою нитью любви!

Ирина Сусленко

* * *

Старина серой птицею восемь веков
С высоты живописных полесских холмов
Отражается в зеркале припятских вод –
Здесь история жизни начало берет
Белорусского города – Мозырь! Года
Омывают его, словно берег вода...
Позади первобытный охотничий крик
И татаро-монгольский прищуренный лик,
Гомон бурных торгов, лязг орудия войн
Под Михайловских колоколов перезвон...
...Отшумели ветра лихолетий, и вот
Город Мозырь отстроен, наш город – цветет!
В гуще важных событий судьбу он вершит,
Для людей деловитых – и щедр, и открыт.
А талантом своим на весь мир знаменит
Мозырь – труженик, Мозырь – артист и пиит.
Так храни его, Бог, от беды и огня, –
Отчий дом и любовь, и судьбу мозырян!

**С ДНЕМ РОЖДЕНИЯ, МОЗЫРЬ!**

В осенней Припяти купается заря,
Клубит туман прохладную истому,
И более ста тысяч мозырян
Вверяют судьбы городу родному,
Уверено шагая в новый день.
И солнце этот путь благословляет...
Друзья мои, давайте без затей
Сегодня скажем просто: «Поздравляем,
Тебя, наш Мозырь, милый отчий дом.
Живи в трудах и долго, и счастливо,
И через много лет своим теплом
Храни потомков наших и дари им силу!»

Ирина Сусленко

## СТАРИННЫЙ МОЗЫРЬ

Замок венчает Спасскую гору –
Башни над площадью будто парят...
Плещется парка зеленое море,
Как и столетья назад.
Славен историей, славен победами,
Славен людьми небольшой городок:
Всею душою мы Мозырю преданы –
В нем нашей силы исток.

Ветры разбудят дремавшее облако,
В Припяти нежно качнется волна...
Чтоб ни случилось, мы – рядом, мы – около,
Все одолеем сполна.
Милый, старинный, единственный Мозырь!
Бремя веков – как пылинки с плеча...
В твой день рождения апофеозы
Пусть на весь мир прозвучат!

* * *

Мой Мозырь... Мой Мазыр!
Знаёмы... Неизвестный...
И в зной, і ў маразы
Прывабны... интересный.
Аддадзена душой
Табе беззапаветна!
И к радости большой
Моя любовь – ответна...

Ирина Сусленко